# Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

29 лістапада 2017 г. №45 (429)





стар. 2

**Прыватнаму гандлю развязалі рукі**



стар. 6

**Калі зачыняюць краму...**



стар. 8

**Выхаванне сабакі... і чалавека**

ТЭМА ТЫДНЯ

# СПАКОЙНА І ЎЗВАЖАНА




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Якой павінна быць дзяржаўная палітыка ў дачыненні да зваротаў грамадзян

**НАПІСАЦЬ кіраўніку дзяржавы, звярнуцца ў Адміністрацыю Прэзідэнта — такі варыянт вырашэння праблемы многія трымаюць «на запас», і ён лічыцца самым эфектыўным спосабам вырашыць пытанне. Некаторыя ж нават і не дзеляць свае звароты на істотныя і не вельмі — і адразу звяртаюцца па вышэйназваным адрасе.**

стар. 4

ДАТА

# СТО ГАДОЎ НА СЛУЖБЕ Ў ЛЮДЗЕЙ

**Магілёўскія народныя абраннікі ў бліжэйшыя дні адзначаць стагадовы юбілей з дня заснавання гарадскога Савета дэпутатаў**

**Гэта адбудзецца ўжо 8 снежня. І народныя абраннікі Магілёва паставіліся да гэтай падзеі як заўсёды адказна. У выдавецтве «АмеліяПрынт» амаль скончана работа над багатым на рэдкія гістарычныя фотаздымкі і дакументы выданнем, прысвечаным стагадовай даце. Гэта працяг кнігі «Гісторыя Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў (1917—2014 гады)», якую тры гады таму пры дапамозе гарсавета дэпутатаў падрыхтаваў магілёўскі гісторык Міхаіл Рыськоў. Ён жа стаў аўтарам і новага выдання.**



### ФОТА З АРХІВАЎ

— Зроблены своеасаблівы летапіс Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў, іншымі словамі — гісторыі Магілёва, бо гэта, лічы, адно і тое ж, — кажа Міхаіл Рыськоў. — Дэпутаты заўсёды былі першымі на галоўных кірунках развіцця горада. У альбоме ўпершыню друкуюцца дзясяткі фатаграфій дэпутатаў Магілёўскага гарсавета, якія раней былі вельмі вядомыя ў Магілёве, а потым сталі цалкам забытыя. Прыйшлося добра папрацаваць у магілёўскіх архівах, каб аднавіць справядлівасць.

Сем раздзелаў уключаюць у сябе ўсе перыяды гісторыі гарадскога Савета. Усё пачынаецца з таго моманту, калі ў Магілёве знаходзілася апошняя стаўка цара. Ёсць унікальнае фота, дзе Мікалай II з цэсарэвічам Аляксеем сядзяць на лаўцы ў садзе на вале (цяперашні парк імя Горкага). Там ужо тады было электрычнае асвятленне.

стар. 3